ПАЧУЙ, БОЖА, МАЛІТВУ МАЮ

БАЖЭСТВЕННАЯ ЛІТУРГІЯ

СВЯЦІЦЕЛЯ ІААНА ЗАЛАТАВУСТА

ПРАВАСЛАЎНАЕ БРАЦТВА СВВ. ВІЛЕНСКІХ МУЧАНІКАЎ
ІС ХС НІ КА
МІНСК

БАЖЭСТВЕННАЯ ЛІТУРГІЯ

СВЯЦІЦЕЛЯ ІААНА ЗАЛАТАВУСТА

ТРАПАРЫ І КАНДАКІ

ПАМЯННІК

Мінск
2016

Рэкамендавана да выдання Выдавецкім Саветам
Беларускай Праваслаўнай Царквы
Рашэнне № ИС Б16-602-0039

Духоўна-асветніцкае выданне

БАЖЭСТВЕННАЯ ЛІТУРГІЯ
святіцеля Іаана Залатавуста

Выданне 4-е, выпраўленае

Падрыхтавана
Брацтвам у гонар Віленскіх мучанікаў
Антонія, Іаана і Яўстафія ў г. Мінску
Беларускай Праваслаўнай Царквы

Пераклад літургіі
протаіерэя Сергія Гардуна

Трапары, кандакі друкуюцца паводле выд.:
Беларускі праваслаўны каляндар, 2017.
– Мінск: Прыход Св.-Петра-Паўлаўскага сабора, 2016.

Падпісана да друку 12.11.2016. Фармат 60х84 1/16. Папера афсетная.
Тыраж 200 экз.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/197 ад 20.02.2014.
“Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора ў г. Мінску” Мінскай епархіі Беларускай
Праваслаўнай Царквы.
Петра-Паўлаўскі сабор, вул. Ракаўская, 4,
220004, г. Мінск, bpbtvm@tut.by.
www.sppsobor.by

© Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора ў г. Мінску, 2016

ЛІТУРГІЯ АГЛАШЭННЫХ

Дыякан: Благаславі, улады́ка.

Свяшчэннік: Благаславёна Царства Айца, і Сына, і Святога Духа, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

ВЯЛІКАЯ (МІРНАЯ) ЕКЦЯННЯ

Дыякан: У мі́ры Госпаду памолімся.

За мір з вышы́нь і спасе́нне душ нашых Госпаду памолімся

За мір усяго свету, добры стан святых Божых Цэркваў і з'ядна́нне ўсіх Госпаду памолімся.

За святы́ храм гэты і за тых, што з вераю, благагавеннем і страхам Божым уваходзяць у яго, Госпаду памолімся.

За вялікага Спадара́ і айца нашага Святейшага Патрыярха Кірыла і за Экзарха яго Спадара́ нашага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Мітрапаліта Паўла *[і за Спадара нашага (Высока)праасвяшчэннейшага (архі)епіскапа (імя)]*, шаноўнае прасві́тарства, у Хрысце́ дыяканства, за ўвесь прычт і людзей Госпаду памолімся.

За Богам сцераженую краіну нашу, улады і воінства яе Госпаду памолімся.

За горад гэты (*вёску гэтую, святы манастыр гэты*), усякі горад і краіну і за тых, што вераю жывуць у іх, Госпаду памолімся.

За спрыяльнае надвор'е, за багаты ўраджай пладоў зямных і часы́ мірныя Госпаду памолімся.

За падарожных на вадзе і зямлі, хворых, тых, што паку́туюць, паланёных і за спасенне іх Госпаду памолімся.

Каб пазба́віцца нам ад усякага гора, гневу і нястача́ў, Госпаду памолімся.

Заступі, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Прасвятую, Прачыстую, Найблагаславе́ннейшую, слаўную Улады́чыцу нашу Багародзіцу і Вечнадзеву Марыю з усімі

святы́мі памяну́ўшы, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыццё наша Хрысту Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Бо нале́жыць Табе ўсякая слава, пашана і пакланенне – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

АНТЫФОН 1

Хор: Благаславі, душа мая́, Госпада. Благаславёны Ты, Госпадзі. Благаславі, душа мая́, Госпада і ўся ўну́транасць мая́ – імя́ святое Яго.

Благаславі, душа мая́, Госпада, і не забывай усіх дабрадзе́йстваў Яго.

Ён ачышча́е ўсе беззаконні твае, ацаля́е ўсе не́мачы твае.

Вызваля́е ад пагібелі жыццё тваё, вянча́е цябе міласцю і шчодрасцямі.

Насыча́е добро́тамі жада́нне тваё, абнаўля́ецца, як у арла, маладосць твая.

Робіць справядлівасць Гасподзь і суд усім пакры́ўджаным. Ён паказаў шляхі Свае Маісею, сына́м Ізра́ілевым – спра́вы Свае.

Шчодры і мі́ласцівы Гасподзь, доўгацярпліві і мнагамі́ласцівы.

Не да канца гне́ваецца і не навек абура́ецца.

Не па беззаконнях нашых зрабіў нам і не па граха́х нашых даў нам.

Бо як высо́ка неба над зямлёю, так вялікая міласць Госпада да тых, што баяцца Яго.

Як далёка ўсход ад захаду, так аддаліў Ён ад нас беззаконні нашы.

Як мі́луе бацька сыноў, так мі́луе Гасподзь тых, што баяцца Яго.

Бо Ён ве́дае састаў наш, помніць, што мы – пыл.

Чалавек – як трава, яго дні; як кветка палява́я, так ён адцвіце́.

Бо дух адыдзе ад яго – і не будзе яго, і не пазнае ён ужо месца свайго.

Міласць жа Гасподняя ад веку і да веку да тых, што баяцца Яго.

І праўда Яго на сынах сыноў тых, хто захоўваюць запавет Яго і помняць запаведзі Яго, каб выконваць іх.

Гасподзь на небе паставіў прастол Свой, і царства Яго ўсім валодае.

Благаславіце Госпада, усе ангелы Яго, моцныя сілай, выкана́ўцы слова Яго, паслухмяныя голасу слоў Яго.

Благаславіце Госпада, усе воінствы Яго, слу́гі яго, выкана́ўцы волі Яго.

Благаславіце Госпада, усе справы Яго, ва ўсіх ме́сцах валада́рства Яго.

Благаславі, душа мая́, Госпада, і ўся ўнутранасць мая́ – імя́ святое Яго. Благаславёны Ты, Госпадзі.

МАЛАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў мі́ры Госпаду памолімся.

Заступі́, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Прасвятую, Прачыстую, Найблагаславе́ннейшую, слаўную Улады́чыцу нашу Багародзіцу і Вечнадзеву Марыю з усімі святы́мі памяну́ўшы, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыццё наша Хрысту Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Бо Тваё ўлада́нне, і Тваё ёсць Царства і сіла, і слава – Айца, і Сына, і Святога Духа, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

АНТЫФОН 2

Хор: **Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу.**

Хвалі́, душа мая́, Госпада. Буду хваліць Госпада ў жыцці маім; буду спяваць Богу майму, пакуль я ёсць.

Не спадзява́йцеся на князёў, на сы́на чалавечага, у якім няма спасення.

Выходзіць дух яго, і ён вярта́ецца ў зямлю́ сваю; у той дзень зніка́юць усе заду́мы яго.

Блажэ́нны, каму памочнік Бог Іакава, у каго надзея на Госпада Бога яго.

Які стварыў неба і зямлю́, мора і ўсё, што ў іх.

Які вечна захоўвае ісціну, учыня́е правасуддзе пакры́ўджаным, дае́ ежу галодным.

Гасподзь вызваля́е вя́зняў, Гасподзь умудра́е сляпых.

Гасподзь выпрамля́е сагнутых, Гасподзь лю́біць пра́ведных.

Гасподзь ахоўвае прышэ́льцаў, падтры́млівае сіраты́ і ўдавы́; а шлях грэшных знішча́е.

Гасподзь будзе ца́рстваваць у векі, Бог твой, Сіёне, з роду ў род.

І цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Амінь.

АДЗІНАРОДНЫ СЫНЕ

Адзінародны Сы́не і Слова Божае, несмяротны Ты, і пажада́ў дзеля нашага спасення прыня́ць плоць ад Святой Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі, і, не змяніўшыся, стаў чалавекам; і распя́ты Ты быў, Хрысце́ Божа, і смерцю смерць растапта́ў, Ты адзін са Святой Троіцы, праслаўля́емы разам з Айцом і Святым Духам, спасі нас.

МАЛАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў мі́ры Госпаду памолімся.

Заступі́, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Прасвятую, Прачыстую, Найблагаславе́ннейшую, Слаўную Улады́чыцу нашу Багародзіцу і Вечнадзеву Марыю з усімі святымі памяну́ўшы, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыццё наша Хрысту Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Бо Ты добры і чалавекалюбны Бог, і Табе славу ўзносім – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

АНТЫФОН 3, БЛАЖЭННЫЯ

Хор: У Царстве Тваім памяні́ нас, Госпадзі, як пры́йдзеш у Царства Тваё.

Блажэ́нныя ўбогія ду́хам, бо іх ёсць Царства Нябеснае.

Блажэ́нныя тыя, што пла́чуць, бо яны суце́шацца.

Блажэ́нныя лагодныя, бо яны ўспадку́юць зямлю́.

Блажэ́нныя тыя, што жада́юць і пра́гнуць праўды, бо яны насы́цяцца.

Блажэ́нныя мі́ласцівыя, бо яны памі́лаваны будуць.

Блажэ́нныя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўба́чаць.

Блажэ́нныя міратворцы, бо яны сына́мі Божымі назаву́цца.

Блажэ́нныя гна́ныя за праўду, бо іх ёсць Царства Нябеснае.

Блажэ́нныя вы, калі будуць вас га́ньбіць, і гнаць, і ўсякім словам ліхі́м несправядліва зневажа́ць за Мяне.

Радуйцеся і весяліцеся, бо ўзнагарода ваша вялікая на нябёсах.

Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу і цяпер, і заўседы, і на векі вякоў. Амінь.

МАЛЫ УВАХОД

Дыякан: Прамудрасць! Станьце прама!

Хор: Прыйдзíце, паклонімся і прыпадзём да Хрыстá; спасі нас, Сыне Божы, увасакрэ́слы з мёртвых, што пяём Табе: алілуія.

Замест слоў "уваскрэслы з мёртвых" спяваецца:

у будзёныя дні: **.....у святых дзіўны**

на Ражджаство:**.....народжаны ад Дзевы**

на Хрышчэнне:**.....Які хрысціўся ў Іардане**

на Узнясенне: **.....Які ўзнёсся ў славе**

на Пяцідзясятніцу: **.....спасі нас, Уцяшы́целю добры**

на Праабражэнне:**.....Які праабразіўся на гары**

на Уздзвіжанне:**.....плоццю распя́ты**

у Нядзелю ваій:**.....Які сеў на жарабя́**

у святы Багародзіцы:**.....малітвамі Багародзіцы**

Спяваем трапары і кандакі, адпаведныя дню. Вось трапары і кандакі нядзельныя:

ГЛАС 1

ТРАПАР

Калі ка́мень апячáталі іудзеі,/ і воіны сцераглі Прачыстае Цела Тваё,/ Ты ўваскрэ́с на трэці дзень, Спасіцелю,/ даючы́ свету жыццё./ Дзеля гэтага сілы нябесныя ўсклікáлі да Цябе, Жыццядацелю:/ Слава ўваскрасенню Твайму, Хрысцé,/ слава Царству Твайму, / слава промыслу Твайму, адзіны Чалавекалюбны.

КАНДАК

Уваскрэс Ты як Бог з магілы ў славе / і свет з Сабою ўваскрасіў;/ і прырода чалавечая як Бога апявае Цябе,/ і смерць знікла./ Адам жа весяліцца, Уладару;/ Ева цяпер, з путаў вызваля́емая,/ радуецца, усклікáючы:/ Ты, Хрысцé, Той, Хто ўсім падаé ўваскрасéнне.

ГЛАС 2

ТРАПАР

Калі сышоў Ты да смерці, Жыццё несмяротнае,/ тады пекла ўмярцвіў Ты ззя́ннем Бажаства;/ калі ж і памéрлых з прадоння ўваскрасіў Ты,/ усе сілы нябесныя ўсклікалі:/ Жыццядацелю Хрысцé Божа наш, слава Табе.

КАНДАК

Ты ўваскрэс з магілы, Усемагутны Спасíцелю,/ і пекла, убачыўшы цуд, жахну́лася,/ і мёртвыя паўсталі,/ а стварэнне, бачачы, радуецца з Табою,/ і Адам весяліцца,/ і свет, Спасіцелю мой, апява́е Цябе заўжды.

ГЛАС 3

ТРАПАР

Няхай весяляцца нябесныя,/ няхай радуюцца зямныя,/ бо праявіў магутнасць рукою Сваёю Гасподзь,/ перамог смерцю смерць,/ пéршынцам з мёртвых стаў,/ з глыбінь пякельных вы́звалiў нас / і пада́ў свету вялікую міласць.

КАНДАК

Уваскрэс Ты сёння з магілы, Шчодры,/ і нас узвёў з варот смяротных;/ сёння Адам весяліцца і радуецца Ева,/ а разам і прарокі з патрыярхамі апява́юць няспы́нна / Бажэственную магутнасць ула́ды Тваёй.

ГЛАС 4

ТРАПАР

Светлую ўваскрасення пропаведзь ад ангела ўспрыня́ўшы / і пра́дзедаў асуджэнне адкінуўшы,/ Гасподнія вучаніцы апосталам хва́лячыся гаварылі:/ звергнута смерць, уваскрэс Хрыстос Бог,/ даючы́ свету вялікую міласць.

КАНДАК

Спасіцель і Збавіцель мой / з магілы як Бог уваскрасіў з путаў / народжаных на зямлі,/ і вароты пякéльныя разбурыў / і як Уладар уваскрэс на трэці дзень.

ГЛАС 5

ТРАПАР

Спрадвéчнае Слова Айцу і Духу,/ ад Дзевы народжанае для спасення нашага,/ апяém, верныя, і паклонімся Яму,/ бо пажадáў плоццю ўзысці на Крыж,/ і смерць перацярпéць,/ і ўваскрасіць памéрлых / слаўным уваскрасеннем Сваім.

КАНДАК

Да пекла, Спасіцелю мой, сышоў Ты,/ і вароты разбурыў як усемагутны,/ памéрлых як Стварыцель уваскрасіў з Сабою,/ і смерці джáла знішчыў Ты,/ і Адам ад праклáцця быў вызвалены, Чалавекалюбны,/ таму мы ўсе ўсклікáем:/ спасі нас, Госпадзі.

ГЛАС 6

ТРАПАР

Ангельскія сілы на магіле Тваёй / і вартаўнікі змярцвéлі,/і стаяла Марыя ў магіле,/ шукáючы Прачыстае Цела Тваё./ Ты паланіў пекла, не спакусіўшыся ім,/ Ты сустрэў Дзеву, даючы жыццё./ Уваскрэслы з мёртвых Госпадзі,/ слава Табе.

КАНДАК

Жыццятворчай далонню / памéрлых са змрочных далін уваскрасіўшы ўсіх,/ Жыццядáвец Хрыстос Бог / уваскрасенне падáў чалавечаму роду,/ бо Ён – усіх Спасіцель,/ уваскрасенне, і жыццё, і Бог усіх.

ГЛАС 7

ТРАПАР

Ты разбурыў Крыжом Тваім смерць,/ адкрыў Ты разбойніку рай,/ міраносіцам плач перамяніў Ты / і апосталам прапавéдаць загадáў Ты,/ што ўваскрэс Ты, Хрысцé Божа,/ даючы свету вялікую міласць.

КАНДАК

Ужо больш уладáнне смерці не зможа трымаць людзей,/ бо Хрыстос сышоў, разбураючы і знішчаючы сілы яго./ Звязваецца пекла,/ прарокі згодна радуюцца, гаворачы:/ прадстáў Спасіцель тым, што ў веры,/ выходзьце, верныя, ва ўваскрасенне.

ГЛАС 8

ТРАПАР

З вышынí сышоў Ты, Міласэрны,/ пахаванне Ты прыняў трохдзённае, каб нас вызваліць ад пакут,/ жыццё і ўваскрасенне наша, Госпадзі, слава Табе.

КАНДАК

Уваскрэсшы з магілы, Ты памерлых падняў і Адама ўваскрасіў,/ і Ева весяліцца з Твайго ўваскрасéння,/ і канцы свету святкуюць Тваё з мёртвых паўстáнне, Мнагаміласцівы.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Хор: Госпадзі, памілуй.

Свяшчэннік: Бо Ты Святы, Божа наш, і Табе славу ўзносім – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер і заўсёды...

Дыякан: Госпадзі, спасі набожных і пачуй нас.

Хор: Госпадзі, спасі набожных і пачуй нас.

Дыякан: ...і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

ТРЫСВЯТОЕ

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, памілуй нас (*тройчы*).

Слава Айцу і Сыну, і Святому Духу і цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Амінь.

Святы Несмяротны, памілуй нас.

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, памілуй нас.

Дыякан: Будзем уважлівымі!

Свяшчэннік: Мір усім.

Чытач: І духу твайму.

Дыякан: Прамудрасць!

Чытач прамаўляе пракімен.

ПРАКІМНЫ НЯДЗЕЛЬНЫЯ

ГЛАС 1

Няхай будзе, Госпадзі, міласць Твая на нас, бо мы ўскла́лі надзею на Цябе.

ГЛАС 2

Моц мая і песня мая — Гасподзь, і стаў Ён маім спасеннем.

ГЛАС 3

Спявайце Богу нашаму, спявайце; спявайце Цару нашаму, спявайце.

ГЛАС 4

Як шматлікія справы Твае, Госпадзі, усё прамудрасцю стварыў Ты.

ГЛАС 5

Ты, Госпадзі, захаваеш нас і ўсцеражэш нас ад роду гэтага да веку.

ГЛАС 6

Спасі, Госпадзі, людзей Тваіх і благаславі спа́дчыну Тваю.

ГЛАС 7

Гасподзь моц лю́дзям Сваім дасць, Гасподзь благаславіць людзей Сваіх мірам.

ГЛАС 8

Памаліцеся і будзьце ўдзячныя Госпаду Богу нашаму.

Чытанне Апостала.

Дыякан: Будзем ува́жлівымі!

Чытач чытае зачала з Апостала.

Свяшчэннік: Мір табе.

Чытач: І духу твайму. Алілуія.

Хор: Алілуія (*тройчы***).**

Чытанне Евангелля.

Дыякан: Благаславі, уладыка, дабравесніка святога апостала і евангеліста (*імя евангеліста*).

Свяшчэннік (*благаслаўляючы*): Бог па малітвах святога, слаўнага, усяхвальнага апостала і евангеліста (*імя*), няхай дасць табе слова дабрavéсціць з вялікай сілаю, для спаўне́ння Ева́нгелля Узлю́бленага Сына Свайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста.

Дыякан: Амінь.

Свяшчэннік: Прамудрасць! Станьце прама! Вы́слухаем Святое Ева́нгелле! Мір усім.

Хор: І духу твайму.

Дыякан: Паводле (*імя*) Святога Ева́нгелля чытанне.

Хор: Слава Табе, Госпадзі, слава Табе.

Свяшчэннік: Будзем уважлівымі!

І чытаецца Евангелле. Па заканчэнні чытання:

Хор: Слава Табе, Госпадзі, слава Табе.

СУГУБАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Скажам усе ад усяе душы і ад усяго разуме́ння нашага скажам.

Госпадзі Уседзяржы́целю, Божа айцоў нашых, молімся Табе, вы́слухай і памілуй.

Памілуй нас, Божа, па вялікай міласці Тваёй молімся Табе, вы́слухай і памілуй.

Яшчэ молімся за вялікага Спадара́ і айца нашага Святейшага Патрыярха Кірыла і за Экзарха яго Спадара́ нашага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Мітрапаліта Паўла *[і за Спадара нашага (Высока)праасвяшчэннейшага (архі)епіскапа (імя)]*, і за ўсю ў Хрысце́ бра́цію нашу.

Яшчэ молімся за Богам сцераже́ную краіну нашу, ула́ды і воінства яе, каб нам ве́сці ціхае і спакойнае жыццё з усёй набо́жнасцю і годнасцю.

Яшчэ молімся за братоў нашых свяшчэннікаў, іераманахаў і за ўсё ў Хрысце́ брацтва наша.

Яшчэ молімся за блажэнных і заўсёды па́мятных святейшых патрыярхаў праваслаўных і за заснава́льнікаў гэтага святога храма і за ўсіх ужо спачы́лых айцоў і братоў, што тут ляжаць і ўсюды, праваслаўных.

Тут устаўляюцца прашэнні на розныя патрэбы, найчасцей наступнае:

Яшчэ молімся Табе, Госпаду Богу нашаму, пачуй голас маленння нашага і малітву і памілуй рабоў Тваіх: (*імёны*), благадаццю і шчодрасцямі Тваімі, і задаволь усе прашэ́нні іх і прабач ім усе правіны вольныя і міжвольныя: няхай добра будуць прыня́тыя малітвы і мі́ласціны іх перад прастолам Уладарства Твайго, і абаранí іх ад ворагаў бачных і нябачных, ад уся́кай напа́сці, бяды́ і го́расці, і хвароб збаў і пада́й здароўе з даўгалеццем, скажам усе: Госпадзі, вы́слухай і памілуй.

Яшчэ молімся за ахвярада́ўцаў і дабрачы́нцаў у святым і ўсячэ́сным храме гэтым, за тых, што тут спяваюць, працаўнікоў і за ўсіх прысу́тных тут людзей, што чака́юць ад Цябе вялікае і багатае міласці.

Свяшчэннік: Бо Ты міласцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу ўзносім – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

ЕКЦЯННЯ ЗА ПАМЕРЛЫХ

Дыякан: Памілуй нас, Божа, па вялікай міласці Тваёй, молімся Табе, вы́слухай і памілуй.

Яшчэ молімся за ўпакае́нне душ спачы́лых рабоў Божых (*імёны*) і за выбачэ́нне ім усякае правіны, вольнае і міжвольнае.

Каб Гасподзь Бог усялíў ду́шы іх туды, дзе праведныя спачыва́юць.

Міласці Божае, Царства Нябеснага і адпушчэ́ння грахоў іх у Хрыста, несмяротнага Цара і Бога нашага, просім.

Хор: Падай, Госпадзі.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Хор: Госпадзі, памілуй.

Свяшчэннік (*чытае малітву за памерлых*): Божа духаў і ўсякае плоці, Ты смерць перамог і дыявала пакары́ў, і жыццё свету Твайму даў; Сам, Госпадзі, упакой ду́шы спачы́лых рабоў Тваіх (*імёны*) у месцы светлым, у месцы квітне́ючым, у месцы спакойным, адкуль уцяклí паку́ты, журба́ і стагна́нне; усякае саграшэ́нне, учы́ненае імі словам або ўчынкам, або думкаю, як добры і чалавекалю́бны Бог, прабач, бо няма чалавека, які б жыў і не саграшыў: бо Ты адзін толькі без граху́, праўда Твая – праўда навекі, і слова Тваё – ісціна.

Бо Ты ўваскрасенне і жыццё, і ўпакае́нне спачы́лых рабоў Тваіх (*імёны*), Хрысце́ Божа наш, і Табе славу ўзносім з Беспачатным Тваім Айцом і Прасвятым, і Добрым, і Жыватворчым Тваім Духам, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

ЕКЦЯННЯ ЗА АГЛАШЭННЫХ

Дыякан: Памаліцеся, аглашэ́нныя, Госпаду.

Верныя, за аглашэнных памолімся, каб Гасподзь памілаваў іх.

Каб наста́віў іх сло́вам ісціны.

Каб адкрыў ім Ева́нгелле праўды.

Каб далучы́ў іх да Святой Сваёй, Саборнай і Апостальскай Царквы.

Спасі, памілуй, заступі́ і захавай іх, Божа, Тваёю благадаццю.

Аглашэнныя, гало́вы вашы перад Госпадам схілі́це.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Каб і яны з намі славілі найпачэ́снейшае і ве́лічнае імя́ Тваё – Айца, і Сына, і Святога Духа, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Па заканчэнні гэтай екцені ў старажытнасці няхрышчаным належала пакінуць храм, пра што дыякан нагадвае словамі:

Дыякан: Усе аглашэнныя, вы́йдзіце. Аглашэнныя, вы́йдзіце. Усе аглашэнныя, вы́йдзіце. Няхай ніхто з аглашэнных не застае́цца, толькі верныя, яшчэ і яшчэ ў мі́ры Госпаду памолімся.

ЛІТУРГІЯ ВЕРНЫХ

Хор: Госпадзі, памілуй.

Дыякан: Заступі́, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Хор: Госпадзі, памілуй.

Дыякан: Прамудрасць.

Свяшчэннік: Бо нале́жыць Табе ўсякая слава, пашана і пакланé́нне – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

СКАРОЧАНАЯ ВЯЛІКАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў мі́ры Госпаду памолімся.

За мір з вышы́нь і спасенне душ нашых Госпаду памолімся.

За мір усяго свету, добры стан святых Божых Цэркваў і з'яднáнне ўсіх Госпаду памолімся.

За святы́ храм гэты і за тых, што з верай, благагавéннем і страхам Божым уваходзяць у яго, Госпаду памолімся.

Каб пазбáвіцца нам ад усякага гора, гневу і нястачы, Госпаду памолімся.

Заступí, спасі, памілуй і захавáй нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Дыякан: Прамудрасць.

Свяшчэннік: Каб мы, пад улáдаю Тваёю заўжды ахавáныя, Табе славу ўзнóсілі – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

ХЕРУВІМСКАЯ ПЕСНЯ

Мы, Херувімаў тайна яўляючы і Жыватворчай Троіцы трысвятýю песню спявáючы, усякі цяпер адкладзéм жыццёвы клóпат.

ВЯЛІКІ УВАХОД

Дыякан: Вялікага Спадарá і айца нашага Кірыла, Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі, і Спадарá нашага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Паўла, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, няхай памянé Гасподзь Бог у Царстве Сваім, заўжды, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Праасвяшчэнных мітрапалітаў, архіепіскапаў і епіскапаў, і ўвесь свяшчэнніцкі і манашаскі чын, і прычт царкоўны, брáцію святога храма гэтага, вас і ўсіх праваслаўных хрысціян няхай памянé Гасподзь Бог у Царстве Сваім, заўжды, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь. Каб Цара ўсіх мы прынялí, Якога нябачна суправаджáюць áнгельскія чыны́. Алілуія, алілуія, алілуія.

ПРАСІЦЕЛЬНАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Дапоўнім малітву нашу Госпаду.

За ўскла́дзеныя Пачэ́сныя Дары́ Госпаду памолімся.

За святы́ храм гэты і за тых, што з вераю, благагаве́ннем і страхам Божым уваходзяць у яго, Госпаду памолімся.

Каб пазба́віцца нам ад усякага гора, гневу і няста́чы, Госпаду памолімся.

Заступі, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Каб увесь дзень быў даскана́лым, святы́м, мірным і бязгрэ́шным, у Госпада просім.

Ангела мі́ру, вернага настаўніка, ахоўніка душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэ́ння і адпушчэ́ння грахоў і правіннасцей нашых у Госпада просім.

Добрага і карысна́га ду́шам нашым і міру для свету ў Госпада просім.

Астатні час жыцця́ нашага ў мі́ры і пакая́нні праве́сці ў Госпада просім.

Хрысціянскага сканчэ́ння жыцця́ нашага, бязбольнага, непасаро́мленага, мірнага, і добрага адказу на Страшным судзе́ Хрыстовым просім.

Прасвятую, Прачы́стую, Найблагаславе́ннейшую, Слаўную Улады́чыцу нашу Багародзіцу і Вечнадзеву Марыю з усімі святымі памянуўшы, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыццё наша Хрысту́ Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Шчодрасцямі Адзінароднага Сына Твайго, з Якім благаслявёны Ты з Прасвятым, і Добрым, і Жыватворчым Тваім Духам, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: Мір усім!

Хор: **І духу твайму.**

Дыякан: Узлю́бім адзін аднаго, каб у аднаду́мнасці вызнава́ць.

Хор: **Айца, і Сына, і Святога Духа – Троіцу Адзінасу́тную і Нераздзе́льную.**

Дыякан: Дзверы, дзверы! Да прамудрасці будзем уважлівымі.

СІМВАЛ ВЕРЫ

Хор: **Верую / ў адзінага Бога Айца, Уседзяржы́целя,/ Тварца́ неба і зямлі́, усяго ба́чнага і няба́чнага./ І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага,/ Адзінаро́днага, ад Айца наро́джанага перад усімі вякамі;/ Святло ад Святла, Бога ісціннага ад Бога ісціннага,/ наро́джанага, не ство́ранага, адзінасу́тнага з Айцом, праз Якога ўсё сталася./ Які дзеля нас, людзей, і дзеля нашага спасення сышоў з нябёс / і ўцяле́сніўся ад Духа Святога і Дзевы Марыі, і стаў чалавекам./ Быў распя́ты за нас пры Понціі Пілаце,/ і пакутаваў, і быў пахаваны. І ўваскрэс на трэці дзень згодна з Пісаннем./ І ўзышоў на нябёсы, і сядзі́ць правару́ч Айца./ І зноў прыйдзе ў славе судзіць жывы́х і мёртвых, і Яго Царству не будзе канца./ І ў Духа Святога, Госпада, Жыватворчага, што ад Айца зыхо́дзіць,/ што з Айцом і Сынам разам пакланя́емы і сла́вімы, што гаварыў праз прарокаў./ У адзіную Святую Саборную і Апостальскую Царкву./ Вызнаю́ адно хрышчэнне для адпушчэ́ння грахоў./ Чакаю ўваскрасення мёртвых / і жыцця́ бу́дучага веку. Амінь.**

Дыякан: Станем добра, станем са страхам, будзем уважлівымі, каб святое прынашэ́нне ў мі́ры прыно́сіць.

Хор: **Міласць міру, ахвяру хвале́ння.**

Свяшчэннік: Благадаць Госпада нашага Ісуса Хрыста і любоў Бога Айца, і супольнаць Святога Духа няхай будуць з усімі вамі.

Хор: **І з духам тваім.**

Свяшчэннік: Угару́ ўзні́мем сэрцы.

Хор: Мы ўзнялí да Госпада.

Свяшчэннік: Падзя́куем Госпаду.

Хор: Дастойна і праведна ёсць пакланя́цца Айцу, і Сыну, і Святому Духу – Троіцы Адзінасутнай і Нераздзельнай.

Свяшчэннік: Пераможную песню спява́ючы, выгалошваючы, усклiка́ючы і прамаўля́ючы:

Хор: Святы́, Святы́, Святы́ Гасподзь Савао́ф, напо́ўнены неба і зямля славы Тваёй. Аса́нна ў вышніх! Благаславёны, Хто прыходзіць у імя́ Гасподняе, аса́нна ў вышніх.

Свяшчэннік: Прымíце, ежце, гэта ёсць Цела Маё, якое за вас пераламля́ецца дзеля адпушчэ́ння грахоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: Пíце з яе ўсе, гэта ёсць Кроў Мая Новага Запавету, якая за вас і за многіх праліва́ецца дзеля адпушчэння грахоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: Тваё з Твайго Табе прыносячы згодна з усім і за ўсё.

Хор: Цябе апява́ем, Цябе благаслаўляем, Табе дзякуем, Гаспадзі, і молімся Табе, Божа наш.

Свяшчэннік: Асабліва за Прасвятую, Прачыстую, Найблагаславе́ннейшую, слаўную Улады́чыцу нашу Багародзіцу і Вечнадзеву Марыю.

Хор: Дастойна ёсць сапраўды ўблажа́ць Цябе, Багародзіцу, заўжды блажэ́нную і найчысце́йшую, і Маці Бога нашага. Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафімаў, што непару́шанаю нарадзíла Бога Слова, Існую Багародзіцу, Цябе велічáем.

На літургіі свц. Васілія Вялікага замест "Дастойна ёсць..." спяваем:

Табою радуецца, Благадатная, усякае стварэнне – а́нгельскі сабор і чалавечы род; асвячо́ны храме і ра́ю духоўны, дзеў пахвала́, ад Цябе Бог уцялé сніўся і стаў дзіця́ткам

Той, Хто спрадве́чна Бог наш; бо Ён улонне Тваё прастолам зрабіў і чэ́рава Тваё шырэ́йшым за нябёсы ўчыніў. Табою радуецца, Благадатная, усякае стварэнне, слава Табе!

Свяшчэннік: Найперш памяні, Госпадзі, Вялікага Спадара́ і Айца нашага Кірыла, Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі, і Спадара́ нашага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Паўла, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, і захавай іх для Святых Тваіх Цэркваў у мі́ры, цэ́ласці, паша́не, добрым здароўі, даўгале́цці і каб яны правільна выкладалі слова Тваёй ісціны.

Хор: І ўсіх, і ўсіх.

Свяшчэннік: І дай нам адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам славіць і апява́ць найпачэ́снейшае і ве́лічнае імя́ Тваё – Айца, і Сына, і Святога Духа, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: І няхай будуць міласці Вялікага Бога і Спасіцеля нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі.

Хор: І з ду́хам тваім.

ПРАСІЦЕЛЬНАЯ ЕКЦЯННЯ

Дыякан: Усіх святых памяну́ўшы, яшчэ і яшчэ ў мі́ры Госпаду памолімся.

За прыне́сеныя і асвячоныя пачэ́сныя Дары́ Госпаду памолімся.

Каб чалавекалюбны Бог наш, прыня́ўшы іх на святы і наднябе́сны і духоўны Свой ахвя́рнік, як пах водару духоўнага, паслаў нам Бажэ́ственную благадаць і дар Святога Духа, памолімся.

Каб пазба́віцца нам ад усякага гора, гневу і нястачы, Госпаду памолімся.

Заступі, спасі, памілуй і захава́й нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Каб увесь дзень быў дасканалым, святым, мірным і бязгрэшным, у Госпада просім.

Ангела міру, вернага настаўніка, ахоўніка душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэ́ння і адпушчэ́ння грахоў і правіннасцей нашых у Госпада просім.

Добрага і карыснага дýшам нашым і міру для свету ў Госпада просім.

Астатні час жыцця́ нашага ў мíры і пакаянні правéсці ў Госпада просім.

Хрысціянскага сканчэ́ння жыцця́ нашага, бязбольнага, непасаромленага, мірнага; і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Адзінства веры і супóльнасці Святога Духа папрасіўшы, самі сябе, і адзін аднагó, і ўсё жыццё наша Хрысту Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: І спадобі нас, Уладаруý, каб мы з адвагаю, неасýджана смелі заклікáць Цябе, Нябеснага Бога Айца, і прамаўля́ць:

ОЙЧА НАШ

Хор: Ойча наш,/ Які ёсць на нябёсах,/ няхай свяціцца імя́ Тваё, няхай прыйдзе Царства Тваё,/ няхай будзе воля Твая як на небе, так і на зямлі./ Хлеб наш надзённы дай нам сёння;/ і дарýй нам даўгі нашы, як і мы дарýем даўжнікáм нашым;/ і не ўвядзі нас у спакýсу,/ але збаў нас ад злога.

Свяшчэннік: Бо Тваё ёсць Царства, і сіла, і слава – Айца, і Сына, і Святога Духа, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: Мір усім.

Хор: І духу твайму.

Дыякан: Галóвы вашы перад Госпадам схіліце.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Благадаццю і шчодрасцямі, і чалавекалю́бствам адзінароднага Сына Твайго, з Якім Ты благаслявёны разам з Прасвятым, і Добрым, і Жыватворчым Тваім Духам, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Дыякан: Будзем уважлівымі.

Свяшчэннік: Святое – святым!

Хор: Адзін Святы, адзін Гасподзь Ісус Хрыстос, на славу Бога Айца. Амінь.

Хор: Хваліце Госпада з нябёс, хваліце Яго ў вышніх. Алілуія *(тройчы).*

У дні памяці святых:

У вечнай памяці будзе праведнік, нядобрай славы не ўстрашы́цца. Алілуія *(тройчы).*

ПРЫЧАШЧЭННЕ ВЕРУЮЧЫХ

Дыякан: Са страхам Божым і вераю прыступі́це.

Хор: Благаслявёны, Хто прыходзіць у імя́ Гасподняе, Бог ёсць Гасподзь, і Ён явіўся нам.

Свяшчэннік: Верую, Госпадзі, і вызнаю, што Ты сапраўды́ Хрыстос, Сын Бога Жывога, што Ты прыйшоў у свет грэшных спасці́, з якіх першы – я. Яшчэ верую, што гэта Само Прачыстае Цела Тваё і гэта Сама Пачэ́сная Кроў Твая. Таму малюся Табе: памілуй мяне і прабач мне правіннасці маé, вольныя і міжвольныя, у словах, у справах, свядомыя і несвядомыя; і спадобі мяне неасу́джана прычасці́цца Прачыстых Тваіх Тайн, дзе́ля адпушчэння грахоў і дзеля жыцця вечнага. Амінь.

Вячэ́ры Тваёй Тайнай сёння, Сыне Божы, як удзе́льніка мяне прымі́, бо ворагам Тваім я не вы́дам тайны і не дам Табе пацалунка, як Іуда, але, як разбойнік, вызнаю́ Цябе: памяні́ мяне, Госпадзі, у Царстве Тваім. Няхай не ў суд і не ў асуджэ́нне

будзе мне прычашчэнне Святых Тваіх Тайн, Госпадзі, а дзеля ацалéння душы́ і цéла. Амінь.

Хор: Цела Хрыстова прыміце, з Крыніцы несмяротнай спажывіце. Алілуія, алілуія, алілуія.

Свяшчэннік: Спасі, Божа, людзей Тваіх і благаславі спáдчыну Тваю.

Хор: Мы ўбачылі святло ісціннае, прынялí Духа Нябеснага, знайшлі веру ісцінную, Нераздзельнай Троіцы пакланяемся, бо Яна спасла нас.

Свяшчэннік: Заўжды, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь. Няхай напоўняцца вýсны нашы хвалéннем Цябе, Госпадзі, каб мы апявáлі славу Тваю, бо Ты спадобіў нас прычасціцца Святых Тваіх Бажэственных, Несмяротных і Жыватворчых Тайнаў. Захавай нас у Тваім асвячэнні, увесь дзень навучáцца праўдзе Тваёй. Алілуія, алілуія, алілуія.

ЕКЦЯННЯ ПАДЗЯКІ ЗА ПРЫЧАШЧЭННЕ

Дыякан: Станьце прама. Прынявўшы Бажэственныя, Святыя, Прачыстыя, Несмяротныя, Нябесныя і Жыватворчыя, Страшныя Хрыстовы Тайны, належна падзякуем Госпаду.

Заступі, спасі, памілуй і захавáй нас, Божа, Тваёю благадаццю.

Папрасіўшы, каб дзень гэты быў дасканáлым, святы́м, мірным і бязгрэшным, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыццё наша Хрысту Богу аддадзім.

Хор: Табе, Госпадзі.

Свяшчэннік: Бо Ты асвячэнне наша, і Табе славу ўзносім – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: З мірам выйдзем.

Хор: У імя́ Гасподняе.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Хор: Госпадзі, памілуй.

ЗААМВОННАЯ МАЛІТВА

Свяшчэннік: Ты благаслаўляеш тых, хто благаслаўляе Цябе, Госпадзі, і асвячáеш тых, хто спадзяéцца на Цябе. Спасі людзей Тваіх і благаславі спáдчыну Тваю; паўнату Царквы Тваёй захавай; асвяцí тых, хто лю́біць красу́ дома Твайго; праслаў іх за гэта Бажэственнаю Тваёю сілаю і не пакінь нас, якія спадзяёмся на Цябе. Мір свету Твайму дай, цэрквам Тваім, свяшчэннікам, воінству і ўсім лю́дзям Тваім. Бо ўсякае добрае дая́нне і ўсякі дасканáлы дар даéцца звыш і сыходзіць ад Цябе, Айца свяцілаў, і Табе славу, і падзяку, і пакланéнне ўзносім – Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь. Няхай будзе імя́ Гасподняе благаславёным цяпер і давéку (*тройчы*)**.**

ПСАЛОМ 33

Благаслаўлю́ Госпада на ўсякі час, заўжды хвалá Яму ў вуснах маіх. Госпадам будзе хваліцца душа мая́, няхай пачуюць лагодныя і ўзвесяля́цца. Велічáйце Госпада са мною і ўзнясём імя́ Яго разам. Я шукаў Госпада, і Ён пачуў мяне, і ад усіх бед маіх збавіў мяне. Прыступíце да Яго і прасвятлíцеся, і аблíччы вашы не будуць пасаро́млены. Вось убогі паклíкаў, і Гасподзь пачуў яго, і ад усіх бед яго збáвіў яго. Стаіць на вáрце Ангел Гасподні вакол тых, што баяцца Яго, і збаўляе іх. Звéдайце і ўбачыце, які добры Гасподзь; блажэнны чалавек, які спадзяецца на Яго. Бойцеся Госпада, усе святыя Яго, бо не маюць нястáчы тыя, што баяцца Яго. Багатыя збяднéлі і згаладáліся, а тыя, што шукаюць Госпада, не маюць нястáчы ні ў якім дабры. Прыйдзіце, дзеці, паслухайце мяне, страху Гасподняму навучу́ вас. Які той чалавек, што хоча жыць і лю́біць бáчыць добрыя дні? Стры́млівай язык свой ад зла і вусны свае ад каварных слоў. Ухіля́йся ад зла і рабі дабро; шукай міру і сле-

дуй за ім. Вочы Гасподнія – на праведных, і вушы Яго – да малітвы іх. Аблічча ж Гасподняе су́праць тых, хто робіць зло, каб зні́шчыць на зямлі памяць пра іх. Паклі́калі праведныя, і Гасподзь пачуў іх, і ад усіх бед іх збавіў іх. Блізкі Гасподзь да скру́шаных сэ́рцамі і пакорлівых ду́хам Ён зба́віць. Многа бед у праведных, і ад усіх іх зба́віць іх Гасподзь. Захоўвае Ён усе косці іх і ніводная з іх не зламáецца. Смерць грэшнікаў лю́тая, і хто ненавідзіць праведнага, тыя грашáць. Зба́віць Гасподзь ду́шы рабоў Сваіх; і не саграшáць усе, хто спадзяéцца на Яго.

Свяшчэннік: Благаслáвенне Гасподняе на вас Яго благадаццю і чалавекалю́бствам заўжды, цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў.

Хор: Амінь.

Свяшчэннік: Слава Табе, Хрысцé Божа, надзея наша, слава Табе.

Хор: Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу, і цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Амінь. Госпадзі памілуй (*тройчы*)**. Благаславі.**

АДПУСТ

Свяшчэннік: [*Уваскрэслы з мёртвых*] Хрыстос, ісцінны Бог наш*, малітвамі Прачыстае Свае Маці, святых слаўных і ўсяхва́льных апосталаў, святога айца нашага Іаана Залатавуста, архіепіскапа Канстанцінопальскага, і святога (*храма і святога, памяць якога ў гэты дзень*), святых і праведных богаайцоў Іаакіма і Ганны і ўсіх святых, няхай памíлуе і спасé нас, бо Ён Добры і Чалавекалюбны.

* *Замест слоў "Хрыстос, ісцінны Бог наш" прамаўляецца:*

на Ражджаство Хрыстова:

Той, Хто ў вярцéпе нарадзíўся і ў я́слях узлёг дзéля на́шага спасéння, – Хрыстóс, ісцінны Бог наш...

на Абрэзанне:

Той, Хто на вóсьмы дзень па плоці абрэ́зацца пажада́ў дзéля на́шага спасéння, – Хрыстóс, ісцінны Бог наш...

на Богаяўленне:

Той, Хто ў Іардане хрысціцца пажадáў ад Іаана дзéля нáшага спасéння, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

на Стрэчанне:

Той, Хто на рукáх прáведнага Сімяона быць пажадáў дзéля нáшага спасéння, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

у Нядзелю ваій:

Той, Хто на маладóга аслá сéсці пажадáў дзéля нáшага спасéння, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

на Пасху:

Хрыстóс, уваскрэ́слы з мёртвых, Які смéрцю смерць растаптáў і тым, што ў магілах, жыццё дараваў, – íсцінны Бог наш...

на Узнясенне:

Той, Хто ў слáве ўзнёсся ад нас на Нéба і сеў праваруч Бóга і Айцá, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

у Нядзелю Пяцідзясятніцы:

Той, Хто ў вы́глядзе вóгненных языкóў з Нéба паслáў Святóга Свайгó Дýха на святы́х Сваіх вýчняў і апóсталаў, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

на Праабражэнне:

Той, Хто на гары́ Фавóрскай праабразíўся ў слáве перад святы́мі Сваíмі вýчнямі і апóсталамі, – Хрыстóс, íсцінны Бог наш...

Хор: **Вялікага Спадарá і айца нашага Кірыла, Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі, і Спадарá нашага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Паўла, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі,** *[і Спадара нашага (Высока) праасвяшчэннейшага (імя), (архі)епíскапа (тытул яго)]*, **настаяцеля, брáцію і прыхаджáн святога гэтага храма і ўсíх праваслаўных хрысція́н, Госпадзі, захавáй іх на многія лéты.**

ТРАПАРЫ І КАНДАКІ ДВУНАДЗЯСЯТЫМ СВЯТАМ

Трапар свята Раждаства Хрыстовага, глас 4

Ражджаство Тваё, Хрысце Божа наш, / азарыла свет святлом ісціны, / бо праз яго служыцелі зорак / зоркаю навучаны былі / пакланяцца Табе, Сонцу праўды, / і пазнаць у Табе Усход з вышыні. // Госпадзі, слава Табе.

Кандак свята Раждаства Хрыстовага, глас 3

Дзева сёння нараджае Вышэйшага за ўсё існае, / і зямля вярцеп Непрыступнаму прыносіць; / ангелы з пастухамі славасловяць, / а валхвы зоркаю падарожнічаюць; // бо дзеля нас нарадзілася Дзіцятка малое — Спрадвечны Бог.

Трапар свята Хрышчэння Гасподняга, глас 1

Калі Ты, Госпадзі, хрысціўся ў Іардане, / выявілася пакланённе Троіцы, / бо голас Айца сведчыў пра Цябе, / Узлюбленым Цябе Сынам называючы, / а Дух, у выглядзе голуба, / сцвердзіў праўдзівасць гэтага слова. / Явіўся Ты, Хрысце Божа, // і прасвятліў свет, слава Табе.

Кандак свята Хрышчэння Гасподняга, глас 4

Явіўся Ты сёння сусвету, / і святло Тваё, Госпадзі, захавалася на нас, / якія свядома апяваем Цябе: / прыйшоў і явіўся Ты — // Святло Непрыступнае.

Трапар свята Стрэчання Гасподняга, глас 1

Радуйся, Благадатная Багародзіца Дзева, / бо з Цябе заззяла Сонца праўды — Хрыстос Бог наш, / Які прасвятляе тых, хто ў цемры. / Весяліся і ты, старац праведны, / прыняўшы ў абдымкі Вызваліцеля душ нашых, // Які дае нам уваскрасенне.

Кандак свята Стрэчання Гасподняга, глас 1

Улонне Дзявочае асвяціўшы нараджэннем Тваім, / і рукі Сімяонавы благаславіўшы раней, як належала, / цяпер і нас Ты ўратаваў, Хрысце Божа. / Прыміры і народы, якія ў варожасці / і ўмацуй людзей, якіх узлюбіў Ты, // адзіны Чалавекалюбец.

Трапар свята Благавешчання Прасвятой Багародзіцы, глас 4

Сёння пачатак нашага спасення / і адвечнай тайны яўленне: / Сын Божы Сынам Дзевы становіцца / і Гаўрыіл благадаць дабравесціць. / Таму і мы з ім усклікнем да Багародзіцы: / "Радуйся, Благадатная, // Гасподзь з Табою".

Кандак свята Благавешчання Прасвятой Багародзіцы, глас 8

Табе, найвышэйшай Ваяводзе, / у гонар перамогі мы, збаўленыя ад бед рабы Твае, Багародзіца, падзяку ўзносім;/ Ты ж, маючы моц непераможную, ад усякіх нас бед вызваляй, каб мы ўсклікалі да Цябе: // "Радуйся, Нявеста, Якая засталася Дзеваю".

Трапар свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім, глас 1

Агульнае ўваскрасенне / яшчэ перад Тваімі пакутамі сцвярджа́ючы, / з мёртвых узняў Ты Лазара, Хрысце Божа. / Таму і мы, як дзеці, несучы́ сімвалы перамогі,/ Табе, Пераможцу смерці, усклі́каем: //Аса́нна ў вышніх! Благаслаўлёны Той, Хто прыходзіць у імя́ Гасподняе!

Кандак свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім, глас 6

На прастоле — на нябёсах, / а на зямлі — на асляня́ці се́дзячы, Хрысце Божа, / прыняў Ты ангелаў усхвале́нне і спевы дзяцей, усклі́ка́ючых да Цябе: // "Благаслаўлёны Ты, Які прыходзіш Адама заклі́каць".

Трапар свята Пасхі, глас 5

Хрыстос уваскрэс з мёртвых, / смерцю смерць растаптаў, / і тым, што ў магілах, жыццё дараваў.

Кандак свята Пасхі, глас 8

Хоць і ў магілу сышоў Ты, Бессмяротны, / але пяке́льную знішчыў сілу, / і ўваскрэс як пераможца, Хрысце Божа, / жанчынам-міраносіцам сказа́ўшы: "Радуйцеся!" / і Тваім апосталам мір дару́ючы, // а па́ўшым даючы́ ўваскрасенне.

Трапар свята Узнясення Гасподняга, глас 4

Узнёсся Ты ў славе, Хрысце Божа наш, / радасць прынёсшы вучням / абяцаннем Святога Духа, / пасля ўмацавання іх Тваім благаславенням, // што Ты — Сын Божы, Збавіцель свету.

Кандак свята Узнясення Гасподняга, глас 6

Выканаўшы справу нашага збаўлення, / і зямное злучыўшы з нябесным, / узнёсся Ты ў славе, Хрысце Божа наш, / ніколі не адлуча́ючыся, а застаючы́ся неадступна, / і абвяшчаючы тым, хто любіць Цябе: // Я з вамі, і ніхто — супраць вас!

Трапар свята Праабражэння Гасподняга, глас 7

Праабразіўся Ты на гары, Хрысце Божа, / паказаўшы вучням Тваім славу Тваю, наколькі было ім магчыма. / Няхай і нам, грэшным, заззяе святло Тваё вечнае, // па малітвах Багародзіцы, Святладаўца, слава Табе.

Кандак свята Праабражэння Гасподняга, глас 7

На гары праабразіўся Ты, / і вучні Твае бачылі славу Тваю, Хрысце́ Божа, наколькі маглі ўспрыня́ць яе, / каб, убачыўшы Цябе распіна́емага, / зразумелі, што мукі Твае – дабравольныя, / і свету прапаведалі, // што Ты сапраўды – Ойчае ззянне.

Трапар свята Успення Прасвятой Багародзіцы, глас 1

Нараджаючы, дзявоцтва захава́ла Ты / і па ўспенні свету не пакінула Ты, Багародзіца. / Перайшла да жыцця, бо Ты — Маці Жыцця, // і малітвамі Тваімі збаўляеш ад смерці душы нашы.

Кандак свята Успення Прасвятой Багародзіцы, глас 2

У малітвах нястомную Багародзіцу / і ў хада́йніцтвах нязменную надзею, / гроб і смерць не ўтрымалі, / бо як Маці Жыцця, / да жыцця перасяліў Яе // Той, што ва ўлонне ўсяліўся заўждыдзявочае.

Трапар свята Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, глас 4

Нараджэнне Тваё, Багародзіца Дзева, / радасць прынесла ўсяму свету, / бо з Цябе заззяла Сонца праўды — Хрыстос Бог наш; / і зняўшы праклятцце, Ён даў благаславенне, // і знішчыўшы смерць, дараваў нам жыццё вечнае.

Кандак свята Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, глас 4

Іаакім і Ганна ад знявагі за бяздзетнасць / і Адам і Е́ва ад пагібелі смяротнай / вы́звaліліся, Прачыстая, праз святое нараджэнне Тваё. / Яго ж святкуюць і людзі Твае, / ад віны́ саграшэнняў пазба́віўшыся, / ускліка-ючы да Цябе: // "Няплодная нараджае Багародзіцу і карміцельку Жыцця нашага".

Трапар свята Уздзвіжання Крыжа Гасподняга, глас 1

Спасі, Госпадзі, людзей Тваіх, / і благаславі спа́дчыну Тваю, / перамогу праваслаўным хрысціянам над праціўнікамі даючы́ // і Тваім Крыжам ахо́ўваючы народ Твой.

Кандак свята Уздзвіжання Крыжа Гасподняга, глас 4

Ты дабравольна ўзышоў на Крыж, / даючы міласці Твае аднаіменнаму з Табою новаму народу, Хрысце Божа, / узрадуй нас сілаю Тваёю, / перамогі над праціўнікамі даючы́ нам, // якія маем дапамогу Твайго Крыжа // і непераможную перамогу.

Трапар свята Уводзін ў храм Прасвятой Багародзіцы, глас 4

Сёння міласці Божай прадвыяўле́нне / і прадказа́нне спасення людзей, / бо ў храме Божым ясна Дзева з`яўля́ецца / і Хрыста ўсім прадвяшча́е. / І мы ўсклікнем Ёй го́ласна: / радуйся, здзяйсне́нне // прамышле́ння Стварыцеля.

Кандак свята Уводзін ў храм Прасвятой Багародзіцы, глас 4

Найчысцейшы храм Спаси́целеў, / шматкашто́ўны хорам і Дзева,/ свяшчэ́нная ска́рбніца славы Божае, / сёння ўводзіцца ў дом Гасподні, уво́дзячы з Сабо́ю благадаць, / што ў Духу Божым, / Яе ж апява́юць Ангелы Божыя: // Яна ёсць жыллё нябе́снае.

ТРАПАРЫ І КАНДАКІ БЕЛАРУСКІМ СВЯТЫМ

Трапар прп. ГЕНАДЗІЮ Магілёўскаму, глас 4 (5. 02)

Як пустынелю́бная галу́бка, / ад мітусліва́га і многамяце́жнага свету ў пусты́ню аддаліўшыся, / чысцінёю і по́стам, малітвамі і пра́цаю / праслáвіў ты Бога ў душы́ і це́ле сваім. / І так набожна пражы́ўшы, / з'явіўся ты, прападобны Генадзіе, абіцелі Любімагра́дскай украсаю, / для манахаў набожнага жыцця пры́кладам / і цёплым малітвеннікам за ўсіх, / хто звяртаецца да цябе з вераю.

Кандак прп. ГЕНАДЗІЮ Магілёўскаму, глас 3

Малітваю і постам, працаю і цярпеннем / умярцвіўшы ўсякае мудрава́нне плоці, / добрапрыстойным умясцілішчам чысціні, / Божественных дароў і цудаў спадкаемцам,/ і для манахаў добрым настаўнікам быў ты, / падзвізаючыся разам з блажэнным Карніліем, ойча Багамудры. / Таму мы ўскліка́ем: маліся да Госпада, / каб па малітвах тваіх Ён даў мір і збаўленне ду́шам нашым.

Трапар блж. ВАЛЯНЦІНЕ Мінскай, глас 1 (6. 02)

З дзяцінства ўспрыня́ўшы веру Хрыстову ў сэрцы сваім, / як мудрая дзева, пране́сла ты праз усё жыццё плады яе, / таму і Хрыстос даў табе сілу / ацаляць хваробы нямоглых і тых, што сумняваюцца. / Мы ж, праслаўляючы цябе, блажэнная маці Валянціна, ускліка́ем: / слава Таму, Які даў табе моц, / слава Таму, Які праславіў цябе, // слава Таму, Які спаса́е ўсіх, хто звярта́ецца да цябе.

Кандак блж. ВАЛЯНЦІНЕ Мінскай, глас 5

Хада́йніцай за нямоглых была́ ты / на зямлі Мінскай, блажэнная Валянціна, / у горасцях, бе́дах і напа́сцях усіх веруючых суцяшаючы, / ба́чачы хваробы і немачы ў тых, хто прыходзіў да цябе, / просім жа і мы, нявартыя, / твайго хадайніцтва перад Прастолам Усявышняга, // каб Ён даў нам мір і спасенне душ нашых.

Трапар свц. ЛАЎРЭНЦІЮ Тураўскаму, глас 8 (11. 02)

Усеблажэнны Лаўрэнціе, які зачыніў сябе дзеля Госпада ў месцы цесным / і ў ім шмат гадоў працалюбна пражы́ў, / маліся за нас да Госпада, каб і мы, ад усякага граху пачуцці зачыніўшы,/ атрымалі адкрыццё дзвярэй міласці Гасподняй у Дзень судны.

Кандак свц. ЛАЎРЭНЦІЮ Тураўскаму, глас 6

Шчыра жадаючы лаўры Пячэрскай цудамі праславіцца, / сябе ж самога ўпакорваючы, / ты адмовіўся ацаліць гаротніка, якога дыявал мучыў, / і адаслаў да пячоры, / дзе ён, ацаліўшыся, / блажэнны Лаўрэнціе, / праславіў з табою Госпада, // Які праслаўляе святых Сваіх.

Трапар свц. СІМЯОНУ Полацкаму, глас 3 (16. 02)

У зямлі Полацкай наро́джаны і вы́хаваны, / архіерэ́йскім са́нам ушанава́ны быў ты, / свяці́целю о́йча Сімяо́не, / Цвярско́й епа́рхіі пе́ршы епі́скап, /

па́ствы сваёй до́бры ахава́льнік, / неразу́мных настаўнік і беззако́нных выкрыва́льнік. / Малі́ся да Го́спада // за ўсіх, хто ўшано́ўвае па́мяць тваю́.

Кандак свц. СІМЯОНУ Полацкаму, глас 4

Ме́раю пра́веднасці стаў ты, ойча наш Сімяо́не, / жыццё сваё паева́нгельску ўладкава́ўшы / і па́ству шчыра навуча́ў ты, / таму ў святле́ невячэ́рнім знахо́дзішся, / Трохсо́нечным Адзі́нствам увянча́ны, / і нас да спасення накіруй // боганатхнёнымі малітвамі тваімі.

Трапар свц. ГЕОРГІЮ Магілёўскаму, глас 3 (26. 02; 6. 08)

Стаўпом Праваслаўя і настаўнікам набожнасці быў ты, / свяціцелю ойча наш Георгіе./ Многа скру́хі ды ганéнняў перацярпеў ты, багамудра паствай сваёй кіруючы, / усіх на спасенне наставіў ты, / Царквы Беларускай пахвала́ і горада Магілёва ўкра́са,/ малі Хрыста Бога, // каб умацаваў Бацькаўшчыну нашу ў набожнасці і спас ду́шы нашы.

Кандак свц. ГЕОРГІЮ Магілёўскаму, глас 8

Як рупліўца апостальскага і Праваслаўя стоўп непахісны / Царква Хрыстова прыносіць Табе, Госпадзі, свяціцеля Георгія, які ў ёй праславіўся. // Па яго малітвах пада́й ду́шам нашым мір і вялікую міласць.

Трапар сшчмч. ІААНУ Рыльскаму, глас 4 (11. 03)

Дабрадзейнасцю жыццё сваё ўпрыгожыўшы, / апостальскай пераемнасці спадобіўся ты, / слова Божае прапаведуючы, / мучаніцкім вянцом быў увянча́ны,/ святы свяшчэннамучанік Іаане. / Зямная Бацькаўшчына твая памяць тваю святкуе / і горад Петрыкаў радуецца./ Зямля Палеская хвалу табе ўзносіць / і з замілаваннем усклікае: / радуйся, навамучанік,/ пахвала́ Праваслаўя.

Кандак сшчмч. ІААНУ Рыльскаму, глас 2

Ты з'явіўся пераможцам подступаў злога, / святы свяшчэннамучанік Іаане,/ перацярпеўшы за веру Хрыстову ганенні і знявагі. / І Хрыстос цябе вянцом мучаніцтва ўвянчаў. / Свяціцельства тваё праслаўляецца ў гарадах Мазыры і Рыльску, / бо ты ўзначальваеш раць навамучанікаў зямлі Палескай. / Таму і мы, гледзячы на твой подзвіг, з вераю ўсклікаем да цябе: / маліся за нас Госпаду і ўмацуй нас у Праваслаўі.

Трапар дбрв. князю РАСЦІСЛАВУ Смаленскаму, глас 6 (27. 03)

Атрымала цябе, будаўніка́ гарадоў і цэркваў, / водамі свяшчэннага Дняпра амы́тая зямля Кіеўская і Смаленская, / а разам з імі і Беларуская, / вялікі княжа Расціславе, / ты явіў правіцелям узор дабраве́рнасці, / сму́ты на Русі спыняючы, / адзінства захоўваючы, / таму Гасподзь табе мудрасць і сілу паслаў / дасягну́ць Царства Нябеснага, / і там з усімі святымі Хрысту Богу маліся, // каб умацаваліся мы ў Праваслаўі, набожнасці і аднадумстве.

Кандак дбрв. князю РАСЦІСЛАВУ Смаленскаму, глас 4

З юнацтва стаў ты Божым умясцілішчам,/ Духам Святым напоўненым, / ад дабраверных бацькоў паходзячы, / вялікі княжа Расціславе-Міхаіле, / Смаленска і Кіева слава і ўсяе Рускай зямлі ўкра́са,/ праваслаўнай веры і набожнасці руплівец,/ гарадоў і цэркваў дбайны будаўнік. / І цяпер, у Нябесным Іерусаліме знаходзячыся / з усімі святымі сваякамі тваімі, / маліся, блажэнны, за горад і людзей, // якія ўшаноўваюць святую памяць тваю.

Трапар прав. САФІІ Слуцкай, глас 5 (1. 04)

Святая праведная маці наша Сафія, / нятле́ннем мошчаў і ззя́ннем цудаў ушанаваў цябе Бог; / і мы, памінаючы тваё праведнае жыццё, / молім цябе вы́прасіць це́лам нашым здароўе // і ду́шам спасенне.

Кандак прав. САФІІ Слуцкай, глас 4

Прыйдзіце, усе жанчыны, / святую Сафію ўсхва́лім, / падобную да мудрых дзеў, якія ялей благадаці Духа Святога атрымалі; / таму і паклікаў яе Гасподзь падзвіза́цца ва ўмацаванні святой Праваслаўнай веры / і захоўваць Царкву Яго непахіснай ад ерасяў і расколаў, / дзеля гэтага з удзячнасцю заспяваем ёй: / радуйся, горада Слуцка і ўсяе зямлі нашай радасць і ўмацаванне.

Трапар св. УЛАДЗІМІРУ Віцебскаму, глас 4 (8. 04)

Паводле слова прарока Давіда, / прыгажосць Дома Божага больш за жыццё ўзлюбіўшы, / і ад бязбожнікаў ганенне, зняволенне і асуджэнне перацярпеўшы,
/ без страху за Праваслаўную веру паку́таваў ты, / святы вызнаўца Уладзімір, / маліся Хрысту Богу, каб і нам гэтай моцы веры дасягну́ць, // і заставацца ў ёй непахісна.

Кандак св. УЛАДЗІМІРУ Віцебскаму, глас 2

Му́жнасць тваю, вызнаўца Уладзімір, праслаўляючы, / чысціню веры ўсхваляем / і дару мудрасці тваёй дзівімся, / бо з нябёс атрымаў ты Божую благадаць // навуча́ць і абараня́ць ста́так Хрыстоў.

Трапар свц. ГАЎРЫІЛУ Магілёўскаму, Разанскаму, глас 5 (20. 04)

Ве́раю і пра́ўдаю Бо́гу слу́жачы, / здабы́ў ты любо́ў па́ствы тваёй, / Гаўрыі́ле свяці́целю, / до́бры па́стыр аве́чак духо́ўных. / У часі́ну выпрабава́нняў скра́дзеных ваўкамі да уніі / ты вярнуў ва ўлонне праваслаўя, / іко́ну Божае Ма́ці "Знаме́нне", назва́ную "Карчо́мнаю", / я́к невычэ́рпную крыніцу суцяшэ́ння / па́стве сваёй указа́ў ты. / І цяпер малі́ся старанна за нас, // якія ўшаноўваем святу́ю па́мяць тваю.

Кандак свц. ГАЎРЫІЛУ Магілёўскаму, Разанскаму, глас 3

Хрыста́ з юнацтва палюбі́ў ты / і за Ім з любо́ўю паслі́едаваў, / му́драсцю свяці́целя Філарэ́та душу́ сваю́ насыча́ючы, / са́на свяці́цельскага спадобіўся, / па́ству Калужскую, Магілёўскую і Раза́нскую, Бо́гам табе

да́дзеную, / дба́йна акармля́ў ты, Гаўрыі́ле свяці́целю, / не перастава́й малі́цца за дзяце́й тваі́х, // каб усе мы пачэ́сную па́мяць тваю́ ра́дасна ўшаноўвалі.

Трапар мчч. АНТОНІЮ, ІАДНУ, ЯЎСТАФІЮ Віленскім, глас 4 (27. 04)
Вы ад зямно́га го́нару і сла́вы адмовіліся, / до́блесныя і сла́ўныя паку́тнікі, / дзе́ля веры стойка і му́жна му́кі перане́слі, / на смерць сябе адда́ўшы за Жыццё ўсіх — Уладара́. / Таму і Хрысто́с з вялі́кай сла́ваю / слупо́м во́блачным з нябёсаў вас азары́ў, / і паша́наю і вянца́мі ад прасто́ла сла́вы ўвянча́ў. / З а́нгеламі сто́ячы прад Ім, / малі́це, каб спасліся ду́шы на́шы.

Кандак мчч. АНТОНІЮ, ІАДНУ І ЯЎСТАФІЮ Віленскім, глас 3
Айцоўскую спакусу адкінуўшы, святыя, / прыве́дзены вы былі́ да Хрыста, / усім душы́ стараннем стаялі мужнамудра да смерці./ Таму і атрымалі вы перамогі гонар належны, // за ўсіх Уладара нашага несупынна молячы.

Трапар сшчмч. КАНСТАНЦІНУ Шаркаўшчынскаму, глас 8 (29. 04)
У веры і набожнасці з юнацтва вы́хаваны, / добрым пастырам стаў дару́чанаму ста́тку, / у са́не іерэ́йскім мучанік Твой, Госпадзі, Канстанцін, / храм і прыход у вернасці Табе захава́ў: / іх жа спаса́й заўсёды ў мі́ры, / па малітвах Багародзіцы, Адзіны Чалавекалю́бны.

Кандак сшчмч. КАНСТАНЦІНУ Шаркаўшчынскаму, глас 6
Блажэ́нны шлях, якім ішоў ты, ойча Канстанціне, / званню свайму дастойна служэнне здзяйсня́ючы, / ад бязбожнікаў паку́ты і смерць прыня́ў ты, / мучаніцкім вянцом упрыго́жыўся / і гаючано́снымі мо́шчамі асвяці́ў зямлю́ По́лацкую, / за горад і людзей хада́йнікам ве́рным з'яўляешся; / маліся Богу за ўсіх, /хто ўшаноўвае цябе.

Трапар мч. дзіцятку ГАЎРЫІЛУ Беластоцкаму, глас 5 (3. 05)
Святы дзіцятка Гаўрыіле, / ты за Праця́тага дзеля нас іудзеямі / люта імі ж у рэбры працяты быў,/ і за Таго, Хто праліў кроў Сваю за нас, / ты ўсё цела тваё на праліццё крыві і лютыя раны аддаў; / цяпер жа ў славе вечнай з Ім пасяліўся ты. / Таму, молім, памяні і нас, якія шануюць памяць тваю, / просячы нашым це́лам здароўе // і выратаванне ду́шам нашым.

Кандак мч. дзіцятку ГАЎРЫІЛУ Беластоцкаму, глас 6
Бацькаўшчына твая была Звяркі, / мучанік Хрыстоў Гаўрыіле, / дзе сапраўднымі звярамі, іудзеямі, ты выкрадзены быў, / раптоўна бацькоў пазбаўлены быў, / потым усе жорсткасці перацярпеўшы, / у айчыну Нябесную перасяліўся ты. / Збаўляй і нас тут ад усякай напа́сці і горасці / і маліся, молімся табе, каб атрымаць нам вечную спадчыну тваю.

Трапар свц. КІРЫЛУ Тураўскаму, глас 4 (11. 05)

Набожнасці паборнік і руплівец, / манахаў і стоўпнікаў пахвалá, / святіцель Тураўскай паствы слаўны, / красамоўны настаўнік,/ светлым вучэннем богапазнання свайго прасвяціў ты краі рускія, / у малітве да Бога благадатны грэшнікаў спрыяльнік, / Кірыле багамудры, / малі Хрыста Бога, каб умацаваліся мы, суайчыннікі твае, // у Праваслаўі, набожнасці і аднадумстве.

Кандак свц. КІРЫЛУ Тураўскаму, глас 5

Нястомным у малітвах, / шчырым падзвіжнікам паслушэнства і набожнасці будучы, / цярплівасці і пакоры навучаў ты паству сваю, / дабрадзейнасцямі святасці і праведнасці статак Хрыстоў прасвятляючы, / і мёдатачывымі словамі ўсю зямлю Рускую насычаючы, / на праведны шлях запаведзяў Гасподніх сілаю духа твайго настаўляў ты ўсіх, / і цяпер прасвятлі, як сонца, людзей, азмрочаных грахамі, // і да пакаяння нас прывядзі.

Трапар сшчмч. МАКАРЫЮ Кіеўскаму, глас 8 (14. 05)

Бажэственныя Бяскроўныя прыносячы Ахвяры, / кроў сваю, бязбожнымі агаранамі пралітую, / у ахвяру беззага́нную прынёс ты Уладару твайму, Пастыраначальніку Хрысту. / Яго ж малі, молім цябе, праліць гнеў на народы, што хочуць войнаў; / хрысталюбнае воінства наша супраць ворагаў умацуй / і статак твой ад усякіх бед непашкоджаным захавай, / бо цябе як моцнага заступніка ўшаноўваем, / новы свяшчэннамучанік зямлі нашае, святіцелю блажэнны Макарые.

Кандак сшчмч. МАКАРЫЮ Кіеўскаму, глас 8

Радуецца горад Кіеў, вялікі скарб атрымаўшы, / тваё тленнем не крану́тае цела, / святіцелю блажэнны Макарые, / бо свой прастол ад нашэсця лютых ворагаў нават да крыві ахоўваў ты. / І цяпер перад Нябесным стаіш Прастолам, / дзе малітоўна перад Тварцом памінай нас, ойча наш, / каб ва ўсіх бе́дах мы мелі цябе прыстанішчам і табою хваліліся, усклікаючы: / радуйся, Макарые, архіерэяў пачэсная ўкра́са.

Трапар Жыровіцкай іконе Божае Маці, глас 2 (20. 05)

Тымі, хто просіць у Цябе дапамогі, не пагрэбуй, Уладычыца, / і міласэрнасці глыбіню́ адкрый усім, хто прыходзіць да гаючаноснай іконы Тваёй. / Спатолі журботы нашы жыццёвыя, Усяшчодрая, / і з гэтай юдолі плачу да радасці вечнай верных Тваіх перавядзі; / бо ў Табе ўсе мы знайшлі надзею і ўмацаванне, міласці крыніцу, / покрыва і ўратаванне душ нашых.

Трапар дбрв. князю БАРЫСУ Тураўскаму, глас 8 (17. 05)

Марнасць часовага жыцця спасцігнуўшы, / ад міжусобіц і сварак ухіліўшыся, / нятленнай славы спадобіўся ты, дабраверны княжа Барысе./ Маліся дбайна Адзінасутнай Троіцы, / каб дзяржаве суродзічаў тваіх быць богаўгоднаю // і сына́м зямлі нашае спасціся.

Кандак дбрв. князю БАРЫСУ Тураўскаму, глас 6

Дабраверны княжа Барысе, / пакаяннем дастойна ачы́шчаны, / маліся Госпаду, каб і мы на шляхах спасення // шляхі жыцця зямнога здзейснілі старанна.

Трапар прпмч. МАКАРЫЮ Пінскаму, глас 4 (26. 05)

За Хрыстом, Які дзеля нас з Нябёсаў сышоў, / ты следам пайшоў у подзвігах тваіх, Макарые, ойча наш. / Яго ж малі за нас, якія ўблажаюць цябе, прабачэнне саграшэнняў нашых дараваць нам, / любоўю і пакораю сэрцы нашы прасвятліць / і спасці душы нашы.

Кандак прпмч. МАКАРЫЮ Пінскаму, глас 4

Нятленнаю прыгажосцю пакорлівага жыцця твайго / Бога на зямлі праславіў ты, / і Божай веры чысціню захоўваць / людзей навучыў ты, / у пакутніцкіх жа подзвігах смерць прыняўшы, / Богам праслаўлены быў ты, // прападобнамучанік Макарый, ойча наш.

Трапар прп. ЕЎФРАСІННІ Полацкай, глас 4 (5. 06)

Пры́клад дванаццацігадо́вага Хрыста, / Які вучы́ў у храме Божаму слову, / пераняла ты, дванаццацігадовая Еўфрасіння, славу часовую і зямнога жаніха пакінуўшы, / і ўсім мірскі́м пагарджа́ючы, прыгажэ́йшаму за ўсіх Хрысту сябе ўнявé сціла ты; / крыж узя́ўшы, шля́хам а́нгельскага жыцця́ ідучы́ і многіх да Яго звярта́ючы, / удухмя́насці міра ў нябесны хо́рам узышла́ ты; / там малі Таго, Якога ўзлюбіла ты, за тых, хто шану́е набо́жна памяць тваю.

Кандак прп. ЕЎФРАСІННІ Полацкай, глас 8

Абра́най Богам ад самага нараджэ́ння і пакліканай на служэ́нне Яму, / табе, якая ў чы́не ангельскім Госпаду паслужы́ла свя́та, і прападо́бна жыла́, / і цяпер з Нябеснымі сіламі Госпада ўсхваля́еш, / за нас жа, грэшных, перад Госпадам хада́йнічаеш, / з радасцю і любоўю ўсклікнем: / радуйся, Еўфрасіння, нявеста Хрыстова ўсяслаўная.

Трапар перанясення мошчаў прп. ЕЎФРАСІННІ Полацкай, глас 3 (6. 06)

Весялі́ся, зямля́ По́лацкая, / ра́дуйся і лікуй, абіцель Спа́сава, / бо вось Гаспо́дзь вы́канаў жада́нне сэ́рца ва́шага: / духо́ўная ма́ці ва́ша і хада́йніца, Еўфрасі́ння багаму́драя, / я́к пту́шка, адляце́ла з го́рада Кі́ева, / і, я́к го́рліца, знайшла́ гняздо́ сваё ў абі́целі старажы́тнага ўдзе́лу свайго́, / дзе збі́ра́е птушаня́таў сваіх пад кры́лы сваé, / каб захава́ць і ўмацава́ць іх у ве́ры пра́веднай, / каб прышэ́сцем гаючано́сных мо́шчаў сваіх прасвятлі́ць азмро́чаных, / сабра́ць параскіда́ных, разагна́ць цемру спакус і бед ад тых, што ўскліка́юць з вераю: / уратуй нас малі́твамі тваімі, як засту́пніца на́ша, прападо́бная ма́ці на́ша Еўфрасі́ння.

Кандак перанясення мошчаў прп. ЕЎФРАСІННІ Полацкай, глас 8
З ве́раю і любо́ю тваё слаўнае перанясе́нне святку́ючы, мо́лімся, блажэ́нная: / захава́й і зберажы́ нас ад уся́кае зло́бы і ерэты́чнай спакусы, / бо ты ма́еш адвагу да Уладара́ ўсіх Хрыста́ Бо́га, / Яго́ ж малі́ спасці́ зямлю́ на́шу і людзе́й, што мо́ляцца табе, каб усе мы ўскліка́лі да цябе́: / ра́дуйся, Еўфрасі́ння, няве́ста Хрысто́ва ўсясла́ўная.

Трапар Сабору Беларускіх святых, глас 5
Ушанава́ў Гасподзь Беларускі край / святымі, што добра дагадзі́лі Яму:/ свяціцелямі, мучанікамі, прападо́бнымі і пра́веднымі, / якія верна Госпаду паслужы́лі / і ўзнагароду за подзвіг атрыма́лі; / да іх жа цяпер і мы ўскліка́ем: / за нас маліцеся Госпаду, / каб мы ў веры і спра́вах плод добры прыне́слі.

Кандак Сабору Беларускіх святых, глас 3
Божыя ўгоднікі Беларускае зямлі / сёння са спадзяваннем стаяць перад Прастолам Святой Троіцы / і нябачна за нас моляцца Богу і за край наш, / просячы нам міру і вялікай міласці.

Трапар свц. ДЗІЯНІСІЮ Полацкаму, глас 2
Сла́ўнага го́рада По́лацка архіпа́стыр, / ве́ры і набо́жнасці руплі́вец,/ подзвігам добрым падзвізаўся ты,/ да спасення бліжніх настаўляючы, / прападобную Еўфрасінню паплечніцаю меў ты. / І нам, свяціцелю Дзіянісіе, // пашлі тваё благаславенне.

Кандак свц. ДЗІЯНІСІЮ Полацкаму, глас 3
Зямлі Полацкай слава, / за паству сваю хадайнікам верным ты з'яўляешся, / свяціцелю ойча наш Дзіянісіе, / работнік вінаградніка Хрыстовага, / маліся за нас Госпаду, / каб мы вераю і справамі прынеслі плады пакаяння.

Трапар свц. МІНУ Полацкаму, глас 1 (3. 07)
Кіеўскіх падзвіжнікаў наследнік дастойны, / прастолам Полацкай Сафіі ты ўзвялі́чаны, / гораду і лю́дзям памочнікам з'яўляешся,/ свяціцелю ойча наш Міна. / Слава Таму, Які даў табе благадаць, / слава Таму, Які ўвянчаў цябе, // слава Спасіцелю Богу, Які дзейнічае праз цябе.

Кандак свц. МІНУ Полацкаму, глас 5
Ад пашаны зямной ухіліўшыся, / славы нябеснай спадобіўся ты, / Божым пакліканнем з глыбіні пячорнай на вышыню свяціцельства ўзышоўшы, / паству Полацкую прымножыў ты, / ойча наш Міна, / малітвеннік дбайны // за ўсіх, хто ўшаноўвае памяць тваю.

Трапар сшмч. МІТРАФАНУ Гомельскаму, Мінскаму, глас 3 (6. 07)
Варонежскай зямлі па́растак, / у інацтве свяціцелю Мітрафану тэзаімяніты, / край Беларускі працаю сваёю ўпрыгожыў, / слова Бо-

жага прапаведнік гучнагалóсы, / Сабора Памеснага вусны боганатхнёныя, / Патрыярха Ціхана папле́чнік верны,/ у горадзе Астрахані свяшчэннамучаніка Іосіфа праславіў ты / і яго пераемнікам на прастоле і ў пакутах стаў, / ойча наш Мітрафане, маліся Хрысту Богу // за спасенне ўсіх, хто ўшаноўвае цябе.

Кандак сшчмч. МІТРАФАНУ Гомельскаму, Мінскаму глас 5

Вызна́ўца ве́ры праваслáўнай, / руплівец прававе́р'я і чысцінí, / свяшчэннамýчанік óйча Мітрафáне, / як пáстыр дóбры і працалю́бны Мáці Царквóю я́ўлены быў ты, / і ваўкóў, што папрыходзілі, каб разбуры́ць яе, не збая́ўся ты, / душý сваю́ за дзяце́й яе ты аддáў, / злóбу дыя́вала любóўю Хрыстóваю перамагáючы, / ты ж і нам памажы́, мóлімся табе, // у цярпе́нні евáнгельскім захавáць дýшы нáшы.

Трапар прп. МАРЦІНУ Тураўскаму, глас 6 (10. 07)

Ад цяжкай хваробы пакýтуючы і людзьмі забы́ты, / маліўся ты, каб смагу наталіць, прападобны Марці́не, / таму Хрыстос паслаў з Нябёсаў дабраве́рных Барыса і Глеба / табе паслужыць і хваробу ацаліць, / маліся цяпер да Госпада, // каб уратаваны былі дýшы нашы.

Кандак прп. МАРЦІНУ Тураўскаму, глас 2

Чысцінёю душы́ боганатхнёна ўзброіўшыся, / і няспынныя малітвы нíбы кап'ё ў руках моцна трымаючы, / працяў ты процьмы дэманаў, Марціне, ойча наш, // маліся няспынна за ўсіх нас.

Трапар прав. ЮЛІЯНІІ Альшанскай, глас 8 (19.07)

Як беззаганная нявеста Нятленнага Жаніха Хрыста, праведная дзева Юліянí́я, / са светлаю свечкаю добрых спраў увайшла ты ў хорам Яго Нябесны / і там са святымі блажэнствам вечным цешышся./ Таму малі Таго, Якога ўзлюбіла ты і Якому дзявоцтва сваё заручыла ты, каб Ён спас дýшы нашы.

Кандак прав. ЮЛІЯНІІ Альшанскай, глас 8

Як храм Божы адушаўлёны, дзявочай чысцінёю добраўпрыгожаны, / ведаем цябе, святая і праведная дзева, князёўна Юліянí́я, / таму, з любоўю святкуючы святых тваіх мошчаў знóйдзенне, / молімся табе, за жаданні нашы надзейная хадайніца: / прынясі за нас малітвы твае да Госпада / і ад усякіх бед вызваляй нас заступніцтвам тваім перад Прастолам Усявышняга, / каб мы ўсклікалі да цябе: "Радуйся, дзева святая Юліянí́я, нявеста Хрыстова цудоўная".

Трапар прпмч. АФАНАСІЮ Брэсцкаму, глас 2 (2. 08; 18. 09)

Блажэнны ты, ойча наш Афанасіе, / бо з вераю жыў ты, стоячы пільна за святую праваслаўную веру, / у замілаванні заўсёды спявáючы несядáльнае Прачыстай, / запаведуючы, каб ніхто не парушаў Праваслаўную веру святую, / і пацярпеў ты за сведчанне ісціны нават

да смерці. / І мы, ушаноўваючы святыню тваю, з адвагаю ўсклікаем да цябе: / ойча наш, прападобнамучанік Афанасіе, пахвала і ўкраса наша.

Кандак прпмч. АФАНАСІЮ Брэсцкаму, глас 2

Як посніка набожнага і дастойнага / і дабравольнага пакутніка пачэснага, / і на жыхара пустэльні падобнага / ў песнях дастойна хвалім Афанасія заўжды слаўнага, / бо ён змея перамог.

Трапар свц. ГЕОРГІЮ Магілёўскаму, глас 4 (26. 02; 6. 08)

Настаў дзень светлай урачы́стасці, / горад Магілёў радуецца, / і з ім усе людзі праваслаўныя спява́юць / спевы і песні духоўныя;/ бо сёння святая ўрачы́стасць праслаўлення святіцеля і цудатворца Георгія,/ які, падобна сонцу незгаса́льнаму, заззяў святлаза́рнымі промнямі, / разганяючы цемру спаку́саў і бед / ад тых, хто ўсклікае з вераю:/ збаўляй нас, бо ты засту́пнік наш, вялікі Георгіе.

Трапар сшчмч. КІПРЫЯНУ Ятранскаму, глас 5 (9. 09)

Як свяшчэннік набожна пражыў ты, / веруючых навучаючы / і мучэння шлях цярпліва прайшоўшы, / пакорлівы ты быў нават да смерці, / свяшчэннамучаніча Кіпрыяне, / малі Хрыста Бога, каб уратаваліся душы нашы.

Кандак сшчмч. КІПРЫЯНУ Ятранскаму, глас 2

Усхвалім, верныя, / свяшчэннамучаніка Хрыстовага Кіпрыяна, / добрага рупліўца веры Праваслаўнай і зямлі нашай гарачага малітоўніка, / які пакутамі сваімі нябёсаў дасягнуў / і там моліць Хрыста Бога, / каб уратаваліся душы нашы.

Трапар прп. МАНЕФЕ Гомельскай, глас 4 (11. 08)

Радуйся, зямля Гомельская, / бо вось, Гасподзь яві́ў цудоўную падзві́жніцу, / якая ў цемры грахоўнай ні́бы сонца заззя́ла, / і ў чы́не мана́шаскім Ева́нгелле лю́дзям абвяшча́ла. / І цяпер нятле́нным це́лам з намі застаючы́ся, / збаўляй нас малітвамі тваімі, // Манефа, маці прападобная.

Кандак прп. МАНЕФЕ Гомельскай, глас 6

З маленства цярпела ты пакуты цялесныя, / якія цудоўным чынам да Хрыста прывялі цябе. / І ў чыне ангельскім Госпаду паслужыла ты, Манефа слаўная, / прасвятляючы людзей, што сядзяць у цемры нявер'я. / Маліла ты Госпада даць ацаленне тым, хто паку́туе. // І цяпер малі Хрыста Бога спасці душы нашы.

Трапар прп. ФЁДАРУ Астрожскаму, глас 4 (24. 08)

Ад княжаскіх дарапрынашэнняў і ўсёй мітусні мірской спешна адмовіўшыся, / да Божых дароў, прамудры Фёдар, шчыра далучы́цца жадаючы, / прыня́ў ты манашаскі чын, / і ў ім пакорлівай паслух-

мянасцю / і маўклівым жыццём Цару Нябеснаму дагаджа́ючы,/ атрымаў ад Яго несмяротныя дары́, // маліся, каб і мы, што ўшаноўваем цябе, атрымалі іх.

Кандак прп. ФЁДАРУ Астрожскаму, глас 1

Фёдара, славы дастойнага,/ які прыгожымі ўбраннямі пагарджа́ючы,/ ад багацця тленнага з удзячнасцю адмовіўся, / і ва ўбранне бясстра́снасці апрануўшыся, / за Хрыстом, багатым на шчодрасці паследаваў, / прыйдзіце, верныя, усхва́лім, / бо ён няспынна моліцца // за нашы душы.

Трапар Мінскай іконе Божае Маці, глас 6 (26. 08)

На водах Свіслачы / з'явілася Ты, Беззаганная Дзева, / ад Цараграда і Кіева / Богам ураторава́наму гораду Мінску міласць паказа́ўшы; / прасвяці нас грэшных зся́ннем Сваім, / з'яві, як заўсёды, сілу Сваю, / уратуй заступніцтвам Сваім / і пазбаў ад напа́сцей варожых, / бо Цябе як неадольную сцяну / і адзіную надзею мы маем.

Трапар прпмч. СЕРАФІМУ Жыровіцкаму, глас 2 (6. 09)

Полымем веры разгарэўшыся, / стаў ты святільнікам Беларускай Царкве, / заззяўшы ў абіцелі Жыровіцкай. / Як пастыр добры, / які веруючых да спасення настаўляў / і жыццё сваё за Хрыста палажыў, / прападобнамучаніча Серафіме,// малі за нас Усяшчодрага Бога.

Кандак прпмч. СЕРАФІМУ Жыровіцкаму, глас 2

Як супо́льнага рупліўца дабравé снікаў Хрыстовых, / і Божае Маці паслу́шніка вернага / і паку́тніка за Царкву Божую пачэ́снага, / у песнях апява́ць будзем архімандрыта Серафіма заўжды ўсхва́ленага: // бо ён змея перамог.

Трапар прав. ІААНУ Кармянскаму, глас 4 (31. 05; 9. 09)

Святы Божы, ойча наш праведны Іаане, / прасвітар слаўны статку Хрыстовага, / у святасці жыццё сваё правёў ты, / да́ру празо́рлівасці і ацалення спадобіўся ты. / І цяпер, нятленным целам з намі застаючы́ся, / малі Хрыста Бога, / каб спас Гасподзь ду́шы тых, хто ўшаноўвае, блажэнны, святую памяць тваю.

Кандак прав. ІААНУ Кармянскаму, глас 6

Ад улоння маці дзівосна прадка́заны, / абра́ннікам Божым з'явіўся ты, / не толькі ў жыцці Богам праслаўлены, / але і пасля смерці нас не пакінуўшы, / у цудоўным яўленні ру́кі за род праваслаўны прасціраючы, / маліся Уладару ўсіх і Цару, / каб памілаваў нас, // якія ўшаноўваюць святую памяць тваю.

Трапар сшчмч. МІКАЛАЮ Віцебскаму, глас 4 (12.09)

Лагоднасці і пакоры дасягну́ўшы, / любоў Хрыстову пастве тваёй засведчыў ты, / бясстрашным абаронцам Царквы Праваслаўнай у час

вогненных выпрабаванняў стаў ты, / свяшчэннамýчанік Мікалай, / знявóленні і выгнáнні, пакуты і смерць ад багаборцаў перацярпеў ты. / Вянец мучаніцкі прыняўшы, / на Нябёсах цяпер радуешся. / Маліся міласціваму Богу, / каб захавáў Царкву нашу ад разладаў, / даў лю́дзям Сваім аднадумства і мір, // і спас дýшы нашы.

Кандак сшчмч. МІКАЛАЮ Віцебскаму, глас 1

Усяхвальны свяшчэннамучанік Мікалай, / пакуты да крыві цярпéўшы, / ты разважаў, што дзеля Госпада мы паміраем, / і змаганне наша не з чалавечай прыродай, / а супраць уладара цемры веку гэтага. / Таму маліся, святы, да Хрыста // даць нам мір і вялікую міласць.

Трапар прп. ЛЯОНЦІЮ Віленскаму, глас 8 (7.10)

Зямлі Пінскай пáрастак, крáю Віленскага квéцень, / Царквы Праваслáўнай абаронца, / éрасі лацінскай залатавýсны выкрывáльнік, / пáстыр дóбры і набожнасці настаўнік, / вéры ісціннай адважны вызнáўца, / прападóбны óйча Ляóнціе, малí Хрыста Бога спасцí дýшы нáшы.

Кандак прп. ЛЯОНЦІЮ Віленскаму, глас 8

Праваслáўя руплíўца і éрасі лацінскай выкрывáльніка, / залатавýснага красамоўца, які я́сна навучáў вéры ісціннай, / і падавáў пры́клад цярплівасці ў бéдах і напáсцях, / яго́, вéрныя, пéснямі дастóйнымі ўшанýем, усклікáючы: / "Рáдуйся, Праваслаўя абарóнца і цвёрды вызнáўца".

Трапар сшчмч. ІААНУ Слуцкаму, Рыжскаму, глас 4 (12. 10)

Воляю Духа Святога і па абранню народа Божага, / прадстаяцелем Латвійскай Царквы стаў ты, / свяшчэннамучанік ойча наш Іаане. / Таму слова Ісціны выкладаючы,/ да самага канца верным застаўшыся / і мучэнні жахлівыя перацярпеўшы, / атрымаў ты ад Бога нятленны вянец, / такі ж атрымаць спадобі // ўсіх, хто ўшаноўвае святую памяць тваю.

Кандак сшчмч. ІААНУ Слуцкаму, Рыжскаму, глас 4

У свяціцельстве набóжна пражыўшы/ і пакýтніцтва шлях прайшоўшы,/ лютае бязбожніцтва вы́крыў ты / і быў абарóнцам стáтку твайго,/ багамýдры ойча наш Іаане, / Царквы Латвійскай прадстаяцель і зямлі Беларускай новы хадайнік. / Таму мы з любоўю усклікáем да цябе: / "Ад усякіх бед і напасцей збаў нас, / якія ўшаноўваем святую памяць тваю". ць Багародзіца Спрадвéчнага Бога.

Трапар прп. ХАРЫЦІНЕ Літоўскай, глас 2 (18. 10)

З юнацтва свайго ўсім сэрцам узлюбіла ты Бога, / Харыціна прападобная, / подзвігі ў веры здзейсніла дзеля Хрыста, Жаніха твайго, / і ў новую Бацькаўшчыну тваю, зямлю Наўгародскую, перасялілася ты, / да Нябеснай Бацькаўшчыны нас паклікаўшы, // моліш ты Хрыста Бога спасці дýшы нашы.

Кандак прп. ХАРЫЦІНЕ Літоўскай, глас 4

Бацькаўшчыну сваю і род пакінуўшы, / да Вялікага Ноўгарада дабра́лася ты, / у абіцелі манашаскай шматцяжкі подзвіг прападобніцкі ўсклала на сябе, / па-ангельску на зямлі пражыўшы, / многім жанчынам праваслаўным шлях да спасення паказала ты. / Таму ўсе мы, звяртаючыся да цябе, усклікаем: / "Радуйся, прападобная маці наша Харыціна".

Трапар сшчмч. архідыякану НІКІФАРУ, глас 5 (19. 10)

Зямлі грэ́часкай па́растак сла́ўны, / свяшчэннамуча́нік архідыя́кан Нікіфар, / лацінскага крывадушша выкрыва́льнік, / веры Праваслаўнай умацава́нне, / за Хрыста ты го́ладам замо́раны, / Яму ж на нябёсах пе́сню спява́еш дзівосную, // маліся і за нас, каб спасліся ду́шы на́шы.

Кандак сшчмч. архідыякану НІКІФАРУ, глас 3

На саборы Берасцейскім ты, Нікіфар, прамудры экзарх, / вы́крыў тых, якія адступіліся ад веры Праваслаўнай, / для Царквы стаў ты стаўпом і абаронцам / і ў цямніцу бязвінна паса́джаны быў, / пакуты і смерць ад лаці́нян прыня́ў ты, / а цяпер у Го́радзе Нябе́сным у Хрыста́ Цара́ з Ангеламі лікуеш.

Трапар сшчмч. АЛЯКСІЮ Лельчыцкаму, глас 2 (20. 10)

Подзвігам добрым падзвіза́ўся ты / і веру захаваў ты нават да крыві́, / свяшчэннамучанік Аляксі́е, / гле́дзячы на пакуты твае, / і мы праслаўляем Госпада, Які праславіў цябе / і даў нам светача новага.

Кандак сшчмч. АЛЯКСІЮ Лельчыцкаму, глас 4

З юнацтва свайго веру захава́ў ты, / і да Хрыста многіх прывёў, / пастырам добрым быў ты, / духоўны ста́так, як авечак ахоўваючы, / мучыцеляў вы́крыў ты, бязбожжа пасаро́міўшы. / Таму і Хрыстос скон твой увянчаў вянцом мучаніцтва, / а мы, славячы цябе, усклі́каем: / "Радуйся Аляксі́е, / прасвітараў пахвала́ і мучанікаў радаванне".

Трапар дбрв. княгіні ЕЎПРАКСІІ Пскоўскай, глас 3 (29. 10)

Малітвы і мі́ласціны як ахвяры богаўго́дныя / прыносіла ты ў жыцці тваім, / і, як Авелева, кроў твая ад бліжняга была праліта́я, / за гэта асаблівым вянцом увянча́ная ты, // дабраверная княгіня Еўпраксія, прападобнамучаніца.

Кандак дбрв. княгіні ЕЎПРАКСІІ Пскоўскай, глас 8

Благадаці мірасховішча шчодрае, / моц Божую ў нямоглым целе явіўшы, / прападобнамучаніцаю стала Еўпраксі́я, / у Полацкай зямлі ўзгадава́ная, / горада Пскова по́крыў і ўкра́са / і ва ўсякім месцы для тых, хто звяртаецца да яе, / у добрых пачына́ннях спрыя́нне.

Трапар навамуч. і вызн. зямлі Беларускай, глас 4 (28. 10)

Святыя навамучанікі зямлі́ Белару́скае, / набо́жнасці свяці́льнікі і жыцця́ева́нгельскага ўзо́ры, / зняволенні, выгна́нні і цяжкія рабо́ты му́жна

перацярпелі вы / і дзеля Хрыста́ нават да крыві́ адпаку́тавалі, / Яго ж як Пачына́льніка свету і Здзяйсня́льніка спасе́ння, / стара́нна цяпер малі́це / памі́лаваць ду́шы на́шы.

Кандак навамуч. і вызн. зямлі Беларускай, глас 8

Навамýчанікі і вызна́ўцы зямлí нашае, / у цяжкіх выпрабава́ннях на́ват да сме́рці любóў да Бога захава́ўшы, / прыклад веры і ўзор набожнасці нам явíлі вы. / Таму цяпер у Нябе́сных хо́рамах лікýючы, / малíце Хрыста́ Бога спасці ду́шы на́шы.

Трапар сшчмч. ПАЎЛІНУ Магілёўскаму, глас 2 (3. 11)

Веры Праваслаўнай беззага́нны захава́льнік, / і запаведзяў Хрыстовых руплівы выкана́ўца, / свяшчэннамучанік Паўлін, / Хрыста ўсім сэрцам узлюбіўшы, / пастваю тваёю ты добра кіраваў. / У халоднай Сібіры мучаніцкую смерць прыня́ў ты, / вянцом славы ўпрыгожаны, / і ў вечнай славе знахóдзячыся, // малі, каб спасліся ду́шы нашы.

Кандак сшчмч. ПАЎЛІНУ Магілёўскаму, глас 8

Абра́ны свяшчэннамучанік і прастолаў апостальскіх намеснік, / горада Магілёва дзівосны светач, / лагоднасцю і незласлівасцю да Агнца Божага падобны, / выгна́нне, цямнічнае знявóленне і пакуты ад бязбожных перацярпе́ўшы, / да самай смерці верным Хрысту застаўся ты, блажэнны. / Ты ж, маючы адвагу перад Госпадам, / прасвятлі азмрочаны розум і сэрцы нашы, каб мы ўсклікáлі да цябе: / радуйся, свяшчэннамучанік Паўліне, старанны за нас да Госпада малітвеннік.

Трапар прп. ЕЛІСЕЮ Лаўрышаўскаму, глас 3 (5. 11)

Прападобны ойча наш Елісее, / з Лаўрэнціем дзіўным падзвізаўся ты, / настаўніку свайму наследуючы; / зямныя славу і гонар да ног Хрыста схілілі вы, / таму Гасподзь увянчаў вас нятленным вянцом славы Сваёй.

Кандак прп. ЕЛІСЕЮ Лаўрышаўскаму, глас 2

Абіцелі Ла́ўрышаўскай памочнік дзівосны, / і ўсяе зямлі Беларускае апякýн, / подзвігу твайму Царква Хрыстова ра́дуецца / і з весялосцю ў сынóўняй любові да Бога звярта́ецца. / Маліся Яму за нас, прападобны Елісе́е, / каб спасліся ду́шы на́шы.

Трапар сшчмч. ІААСАФУ Магілёўскаму, глас 3 (5. 12)

Царквы Рускай стоўп непахісны, / пры́клад набóжнаці, узор жыцця Евангельскага, / свяшчэннамучанік Іаасафе, / дзеля Хрыста пакутаваў ты нават да крыві, / Яго ж малі старанна, як Пачына́льніка і Здзяйсня́льніка спасення, / Русь Святую ўмацава́ць у Праваслаўі да сканчэння веку.

Кандак сшчмч. ІААСАФУ Магілёўскаму, глас 2

Усхва́лім, верныя, / выдатнага сярод свяціцеляў / і слаўнага сярод мучанікаў Іаасафа, / Праваслаўя абаронца і набожнасці рупліўца, / зямлі Рускай цудоўны па́растак; / ён праз пакуты Нябёс дасягнуў /

П А М Я Н Н І К

1-50